**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2019 г.

У лютым ў публічных бібліятэках ДУК былі праведзены разнастайныя мерапрыемствы да Тыдня роднай мовы: літаратурна-паэтычныя гадзіны, урокі беларусазнаўства, выступленні літаратурна-паэтычных груп, Дні роднай мовы. **21 лютага у бібліяіэках сістэмы прайшла акцыя «Размаўляй са мнйо па-беларуску»**.

## <u>Мерапрыемствы да Тыдня роднай мовы</u>

**19 лютага**

Супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з кінатэатрам «Вясёлка» ў рамках праекта «Кніга ў кадры» правялі выязную літаратурную гадзіну ў Батчынскай сярэдняй школе «Не забывай ніколі, дружа». Прысутныя нагадалі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, паўдзельнічалі ў заданнях і конкурсах, накіраваных на кемлівасць і эрудзіраванасць вучняў, у літаратурнай віктарыне «Па старонках роднай мовы». Мерапрыемства завяршылася праглядам мультфільмаў «Беларуская азбука» і «Якія сны сніць мядзведзь?».

ЦРБ, 48 чал.

**21 лютага**

Свята матулінай мовы «Мове роднай пакланіцца» падрыхтавалі супрацоўнікі бібліятэкі сумесна з драматычным гуртком Дома культуры. У праграме свята гучала шмат вершаў, песень, інсцэніраваных казак. Вучні адгадвалі народныя жартоўныя загадкі, узгадвалі прыказкі пра родную мову. Кожнаму з удзельнікаў свята была прадстаўлена магчымасць паказаць беларускі танец, праспяваць беларускую песню, прачытаць верш на беларускай мове.

Батчынска ПБ, 55 чал.

**25 лютага**

У бібліятэцы прайшоў тэматычны Тыдзень, прысвечаны роднай мове пад дэвізам «Размаўляй па-беларуску». Наведвальнікі бібліятэкі нават выпраўлялі памылкі адзін аднаго ў вымаўленні беларускіх слоў. У бібліятэцы арганізавана кніжная выстава «З любоўю да роднага слова». Удзельнікі свята «Каласы роднай мовы», вучні і настаўнікі Рынкаўскай базавай і Тэвельскага дзіцячага сада-пачатковай школ, слухалі гістарычныя факты станаўлення роднай мовы. Удзельнікі клуба «Каласок» услаўлялі родную мову, дэкламуючы прыгожыя беларускія вершы, прыказкі, прымаўкі. Цікавыя загадкі загадала настаўніца Людміла Шэлест. Загадчыца Тэвельскага клуба правяла шэраг беларускіх народных гульняў.

Тэвельская ПБ, 35 чал.

## Мерапрыемствы да Дня абаронцаў Айчыны

**12 лютага**

Урок гістарычнай памяці «Мужеством измеренная жизнь» праведзены для вучняў старэйшых класаў СШ №1 г. Кобрына. Расказана аб вайне ў Афганістане, аб беларускіх воінах-інтэрнацыяналістах, паказаны дакументальны фільм «Солдаты необъявленной войны». Ўспамінамі пра свой удзел у ваенных дзеяннях на тэрыторыі Афганістана падзяліўся маёр Узброеных Сіл, камандзір эскадрыллі Амшанікаў Вячаслаў Міхайлавіч. Мерапрыемства завяршылася праглядам відэароліка кобрынскага барда Ю. Харэвіча «Помните».

ЦРБ, 38 чал.

**13 лютага**

На патрыятычнай гадзіне «Афганистан. Без права на забвение» навучэнцы старэйшых класаў СШ № 3 г. Кобрына пазнаёміліся з гістарычнымі падзеямі вайны ў Афганістане, з тым, як мужна і прафесійна выконвалі свой доўг савецкія салдаты, як у вельмі складаных умовах праяўлялі яны стойкасць і высакароднасць, захоўвалі вернасць ваеннай прысягі і абавязку. Расказ вядучых суправаджаўся паказам прэзентацыі «Чтобы не забыть – надо знать и помнить».

ЦРБ, 42 чал.

**17 лютага**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу правла вечар памяці «Мы не забудем эти десять лет». Вядучыя расказалі гасцям пра мужнасць і гераічнасць салдатаў, якія прымалі ўдзел у ваенных падзеях у Афганістане, пазнаёмілі з тэматычнай выставай «Из пламени Афганистана». Старшыня сельскага Савета павіншавала воінаў-інтэрнацыяналістаў і ўручыла ім памятныя падарункі. Мерапрыемства суправаджалася паказам слайд-прэзентацыі «Афганистан… дни, ушедшие в вечность».

Дзівінскі філіял, 45 чал.

**21 лютага**

Вечар адпачынку «Мужество, доблесть и честь» адбыўся для мужчынскай паловы Кобрынскай РООО «БелТІЗ». З віншавальным словам выступіла старшыня арганізацыі Валянціна Смяховіч, якая ўручыла мужчынам памятныя сувеніры і прызы за ўдзел у тэматычнай віктарыне «Да здравствуют мужчины!». Выдатным падарункам для мужчын стаў святочны канцэрт, падрыхтаваны ўдзельнікамі вакальнай групы цэнтральнай бібліятэкі «Фантазія».

ЦРБ, 40 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**18 лютага**

У незвычайным фармаце прайшло чарговае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» пры Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы: паэты «ваявалі» адзін з адным у паэтычнай дуэлі «Стихоборье», а ў якасці зброі былі

вершы. Пасля кожнай «дуэлі» члены клуба галасавалі за лепшы на іх погляд верш, які найболей адпавядаў абранай дуэлянтамі тэме. У выніку трох колаў дуэлі кожны паэт тройчы мог паўдзельнічаць у «Стихоборье». Пад канец мерапрыемства вызначаны пераможца – Марына Міхалюк.

ЦРБ, 36 чал.

**21 лютага**

У рамках праекта «Школа маладога кіраўніка» прадстаўнікі лепшых навучэнцаў школ горада Кобрына наведалі цэнтральную раённую бібліятэку.

Удзельнікаў мерапрыемства азнаёмілі з асаблівасцямі работы бібліятэчнай установы, з паслугамі, якія прадстаўляюцца бібліятэкай, расказалі пра прафесію бібліятэкара і аб разнастайных мерапрыемствах, якія праводзяцца ў бібліятэцы.

ЦРБ, 42 чал.

**24 лютага**

У рамках апошняга этапу рэспубліканскай акцыі «Безопасность в каждый дом!» і «Единого дня безопасности» супрацоўнікі бібліятэкі і цэнтра культуры і вольнага часу запрасілі працаўнікоў Кобрынскага раённага аддзела па НС для правядзення пазнавальнай гадзіны «Безопасность в каждый дом». Працаўнікі службы выратавання растлумачылі прысутным асноўныя правілы бяспекі, расказалі, як паводзіць сябе, каб пазбегнуць небяспечных сітуацый, а таксама правялі прэзентацыю мабільнага дадатку «МЧС Беларуси: Помощь рядом». Падчас мерапрыемства арганізавана работа інтэрактыўных пляцовак: «Безопасная эвакуация», «Правила поведения в толпе», «Эвакуационные знаки», «Опасная печь», «Первичные средства пожаротушения». Удзельнікі разгадвалі загадкі, расшыфроўвалі словы, адказвалі на пытанні міні-віктарыны.

Стрыгаўская ПБ, 36 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81